- в виконимии: *Извилистая ул.*

**Заключение.** Таким образом, процесс номинации линейного объекта не может быть изолирован от субъективной оценки его с точки зрения номинатора. Заметную группу названий линейных объектов составляют эмоционально-характерологические, которые свойственны как урбанонимной, так и виконимной системам. Среди годонимов, относящихся к эмотивной лексике, преобладают наименования, выражающие положительные эмоции. Отметим, что в семантике годонимов заключена информация о географическом объекте, о его связи с человеком и обществом в целом.

Литература

1. Мезенка, Г.М. Віцебшчына ў назвах вуліц: манаграфія: у 2 ч. / Г.М. Мезенка. – Віцебск : ВДУ імя П.М. Машэрава, 2008. – Ч. 1. – 363 с.
2. Мезенко, А.М. Эмотивная лексика в урбанонимии Витебщины и Смоленщины: представленность, особенности функционирования/ А.М. Мезенко // Смоленск и Смоленщина в именах и названиях: история и современность (к 1150-летию со дня основания города). Сб.статей по материалам докладов и сообщений конференции (Смоленск, 4-5 октября 2012 года). – Смоленск: Маджента, 2012. – С.81-85.
3. Шаховский, В.И. Категоризация эмоций в лексико-семантической системе языка / В.И. Шаховскиий. – Воронеж, 1987. – 24 с.

## НЕКАТОРЫЯ КАНАТАЦЫЙНЫЯ АСАБЛІВАСЦІ ФРАЗЕАЛАГІЗМАЎ У БЕЛАРУСКАЙ І ПОЛЬСКАЙ МОВАХ

***Прышчэпа Ю.Ф.***
*студэнтка 4 курса ВДУ імя П.М. Машэрава, г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь*
Навуковы кіраўнік – Бабіч Ю.М., канд. філал. навук, дацэнт

На сучасным этапе развіцця лінгвістычнай навукі становіцца відавочнай недастатковасць вывучэння мовы толькі як сродку кантактавання, зносін людзей. Мову беларускага этнасу можна назваць народнай энцыклапедыяй, у якой сабраныя ўсе веды і вопыт пра свет мінулых пакаленняў. Моўная народная свядомасць з’яўляецца ўвасабленнем нацыянальнага светаразумення ў слоўнай форме і стэрэатыпах.

У наш час, калі грамадства становіцца ўсё болей шматмоўным, значна павысілася роля супастаўляльнага вывучэння моў. Праблематыка параўнальнага аналізу моў застаецца ў цэнтры ўвагі сучаснай беларускай лінгвістыкі. Супастаўленне адзінак ці фрагментаў пэўных моўных сістэм дазваляе глыбей і больш поўна асэнсаваць катэгорыі кожнай славянскай мовы.

На сёння актуальным у лінгвістыцы з’яўляецца даследаванне канцэптаў, звязаных з характарыстыкай унутранага і знешняга свету чалавека, яго жыццядзейнасці і сацыяльнага статусу.

Актуальнасць гэтага абумоўлена тым, што ў сучасным грамадстве дынамічна развіваецца міжкультурная камунікацыя. Сацыялінгвакультурнае мадэляванне мовы дазваляе раскрыць спецыфіку моўнай свяломасці і камунікатыўных паводзін носьбітаў канкрэтных культур.

Мэта нашага даследавання − выявіць на аснове параўнальнага аналізу ацэначную характарыстыку чалавека ва ўстойлівых спалучэннях (на матэрыяле беларускай і польскай моў).

**Матэрыял і метады.** Даследаванне грунтуецца на матэрыяле “Польска-беларускага слоўніка”, які быў выдадзены ў 2005 годзе пад рэдакцыяй Г.А. Цыхуна. Аўтарамі-ўкладальнікамі слоўніка з’яўляюцца Яўгенія Волкава і Валянціна Авілава. Асноўныя метады даследавання − апісальны, супастаўляльны.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Фразеалагічны фонд беларускай мовы «суправаджаюць» наватворы розных перыядаў эканамічных, сацыяльных і палітычных пераўтварэнняў у грамадстве. У цяперашні час новыя фразеалагічныя выразы пастаянна ўзнікаюць у мове і, актыўна ужываючыся, замацоўваюцца ў фразеалагічным складзе, узбагачаюць яго новымі выразнымі сродкамі. Фразеалагізмы поўна характарызуюць усе бакі жыцця чалавека.

Адна з галоўных функцый фразеалагічнай адзінкі − ацэначная. Адмоўная або станоўчая ацэнка з'яўляецца ў фразеалогіі абагульняльнай кваліфікацыяй. У фразеалогіі няма агульнаацэначных значэнняў «добры/дрэнны». У пераважнай большасці фразеалагізмаў, якія валодаюць тым ці іншым відам ацэначнасці, прысутнічае эматыўная характарыстыка. Наяўнасць эматыўнасці выклікае эмацыйнае суперажыванне, актуалізуе ў слухача / чытача фразеалагічны вобраз.

Здольнасць не столькі называць тыя ці іншыя з’явы, колькі даваць ім ацэнку, уласціва многім фразеалагізмам розных семантыка-граматычных тыпаў.

Як паказвае матэрыял, найбольш выразна ацэначнае значэнне выяўляецца ў назоўнікавых і прыметнікавых фразеалагізмах, напрыклад: **zero bezwzglkdne** – *абсалютны нуль*, **serce zakcze** – *заечая душа*, **giowa kapuњciana** – *галава садовая.*

На думку прафесара Лепешава, з ацэначнай функцыяй рэалізуюцца многія дзеяслоўныя (**mieж muchy w (na) nosie** − *мець мухі ў носе,* **dostaж bzika** – *быць з бзыкам*), а таксама амаль усе несуадносныя фразеалагізмы (**daж sik w znaki** − *дацца ў знакі,* **mieж mleko pod nosem** – *малако на губах не абсохла).*



Репозиторий ВГУ

Ацэначную апасродкаваную функцыю выконваюць і прыслоўныя фраземы: **kiamaж jak z nut** − *хлусіць як па нотах,* **jak fillip z konopli** − *як піліп з канапель* ‘зусім нечакана, знянацку’. Гэта функцыя не прамая, бо выразы характарызуюць не асобу, а яе дзеянне і ўжо праз дзеянне − асобу як носьбіта гэтага дзеяння [1, 211].

Фразеалагізмаў, якія адлюстроўваюць паводзіны чалавека, дастаткова. Адной з найбольш шматлікіх з'яўляецца група фразеалагізмаў са значэннем якаснай ацэнкі асобы.

У залежнасці ад таго, якім уласцівасцям даецца ацэнка, намі вылучаюцца дзве падгрупы:

1) ацэнка індывідуальных якасцяў асобы;
2) ацэнка асобы па яе становішчы ў грамадстве, калектыве.

У межах першай групы на падставе супрацьпастаўлення прыкмет можна вылучыць разрады:

«вонкавае аблічча чалавека» : **mieж mleko pod nosem** – *малако на губах не абсохла* ‘хто-небудзь малады, нявопытны’, **na ustach miod, a w sercu lyd** – *на вуснах мёд, а (на) сэрцы лёд,* **jaka maж, taka paж** − *якая матка, такое і дзіцятка*; «ўнутранае аблічча чалавека», сфера паняційнага зместу, якая ўключае ацэнку інтэлектуальнага развіцця, маральных якасцяў: **cicha woda brzegi rwie** – *у ціхім балоце чэрці вядуцца* ‘ціхі, спакойны толькі на першы погляд‘, **niebieski ptak** – *вольная птушка* ‘свабодны, ні ад каго не залежны чалавек’, **twardy orzech do zgryzienia** – *цвёрды арэшак* ‘пра моцнага чалавека’, **kurza pamiкж** – *курыная памяць.*

Другая падгрупа ўключае два разрады: ацэнка сацыяльнага становішча чалавека і ўзаемаадносіны асобы і калектыву: **gruba ryba** – *важная птушка* ‘чалавек з высокім становішчам, пасадай’, **zero bezwzglкdne** – *абсалютны нуль* ‘нікчэмны чалавек, бескарысны’, **pкpek њwiata** – *пуп зямлі* ‘самы важны, самы галоўны, лепшы за ўсіх’, **rкka rкkк myje** – *рука руку мые* ‘чалавек выгароджвае іншага ў несумленнай справе’, **pi№te koio u woru** – *апошняя спіца ў калясніцы* ‘чалавек, які адыгрывае нязначную ролю ў жыцці’, **znaж pana po cholewach** − ведаць пана па халявах.

Дарэчы, апошняе спалучэнне ўзнікла ў той час, калі этнічная тэрыторыя Беларусі ўваходзіла ў склад Рэчы Паспалітай. У тыя часы польскія паны насілі каляровыя саф’янавыя боты, якія даношвалі за імі слугі. Яны прышывалі да халяў чорныя скураныя галоўкі і гэтым вылучаліся сярод іншых людзей. У выслоўі яскрава адлюстравана стаўленне простага люду да фанабэрыстай панскай чэлядзі.

Асобна можна вылучыць фразеалагізмы са значэннем «формы паводзінаў»: размаўляць, пляткарыць − **nie zostawiж na suchej nitki** − *перамыць усе костачкі,* **laж wodк** − *ліць ваду* ‘гаварыць пустое’; маўчаць −**nabraж wody w usta**, **zasznurowaж usta** − *нібы вады ў рот узяўшы; рызыкаваць* −**ma zielono w giowie** – *у яго вецер у галаве,* **zamienii stryjek siekierkк na kijek** − *памяняць быка на індыка* ‘дзейнічаць неабдумана’; быць у стане ўзбуджэння - адчаю, турботы − **dostaж bzika** – *быць з бзыкам* ‘страціць вартасць, сілу’, **kamiec u szyi** – *камень на шыі* ‘адчуваць душэўныя клопаты’.

**Заключэнне.** Такім чынам, праведзенае даследаванне паказвае, што большасць фразеалагічных адзінак у беларускай і польскай мовах мае падобную структуру, склонавую форму, лікавае значэнне. Але незаўсёды да польскіх фразем можна падабраць слова-адпаведнік у беларускай мове і наадварот. Унутраны свет чалавека, яго светаўспрыманне, характарыстыка асобы падаецца досыць падобна ў блізкароднасных мовах.

З дапамогай даследавання фразеалагізмаў, якія характарызуюць чалавека, магчыма больш глыбока пазнаць светаразуменне беларуса і паляка, навакольнай рэчаіснасці, багацці выразных моўных сродкаў, жыцці народа, вызначыць напрамкі, у якіх неабходна прыкладаць намаганні для развіцця культуры і блізкародных моў.

Літаратура

1. Аксамітаў, А.С. Беларуская фразеалогія. − Мн., 1978. – 222 с.
2. Лепешаў, І.Я. Фразеалогія сучаснай беларускай мовы. – Мн., 1998. − 271 с.

## ВОБРАЗ МАЛОЙ РАДЗІМЫ ЯК ДУХОЎНАЯ АСНОВА ПАЭЗІІ СЯРГЕЯ ПАНІЗНІКА

***Радзіхоўская І.Г.***
*студэнтка 3 курса ВДУ імя П.М. Машэрава, г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь*
Навуковы кіраўнік – Русілка В.І., канд. філал. навук, дацэнт

Сяргей Сцяпанавіч Панізнік – беларускі паэт, празаік, журналіст, перакладчык, краязнаўца, актыўны грамадскі дзеяч. Нарадзіўся 10 мая 1942 года ў вёсцы Бабышкі Міёрскага раёна Віцебскай вобласці, што ў многім вызначыла асноўныя тэматычныя матывы яго творчасці. На сённяшні дзень мы маем шмат матэрыялаў, прысвечаных Сяргею Панізніку, але ў беларускай навуцы пакуль што няма адзінага даследавання, у якім бы сістэматызавана разглядаліся жыццё і творчасць пісьменніка. Актуальнасць дадзенай навуковай працы ўзмацняецца тым, што 2018 год названы Годам малой радзімы.